формирование ценностей в ориентации на языковое сознание членов определенного социокультурного сообщества или региона. Это предполагает изучение зависимости значений лексических единиц от соответствующей нормативной системы ценностей представителей нации. Установка на интерпретацию чужой, неизвестной культуры принципиально отличается от понимания явлений во время общения. Фрагменты чужой культуры усваиваются путем перехода от одной нормативной системы ценностей к другой.

Лингвострановедческий словарь не только дает перевод слов, реалий, фразеологизмов, но и открывает «завесу» культуры, морали, ценностей людей.

Таким образом, важно воспринимать свое языковое, культурное наследие как наследие, имеющее огромную ценность. Не позволительно иметь богатое наследие и не знать о нем: оно – часть того, кто мы есть. Наше наследие – это не только то, что мы должны знать и понимать, но и то, чем следует поделиться с детьми и внуками. Знание своего наследия способствовует формированию духовно-нравственных ориентиров представителей определенного языкового сообщества и региона.

Литература

1. Большакова, М. Г. Лингвокультурологические аспекты профессиональной подготовки переводчика / М. Г. Большакова // Научная конференция «Ломоносовские чтения» : тезисы докладов международной научной конференции студентов, аспирантов и молодых ученых «Ломоносов – 2013», Севастополь, 2013 / редкол.: М. Э. Соколова [и др.]. – Севастополь : ООО «Экспресс - печать», 2013. – С. 396–397.

Л. С. Васюковіч
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава

УДК 811.161.3 (072)

ШКОЛЬНАЯ МОЎНАЯ АДУКАЦЫЯ: СУЧАСНЫЯ МЕТАДЫЧНЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ

Ключавыя словы: моўная адукацыя, аксіялагізацыя адукацыі, лінгвакультуралагічны партрэт слова, каштоўнасныя арыентацыі вучняў.

Аналізуюцца прыярытэтныя задачы сучаснай моўнай адукацыі. Даследуюцца накірункі аксіялагізацыі адукацыйнага працэсу: стварэнне культурна значымага фонду тэкстаў, фарміраванне ўменняў лінгвакультуралагічнага партрэціравання слова. Выяўляецца роля каштоўнасных установак вучняў для гарманічнага суіснавання ў маўленчай прасторы.

L. S. Vasyukovich
Vitebsk State University named after P. M. Masherov

SCHOOL LANGUAGE EDUCATION: MODERN METHODOLOGICAL PRIORITIES

Key words: anguage education, axiologization of education, linguocultural portrait of the word, value orientations of students.

The priority tasks of modern language education are analyzed. The directions of axiologization of the educational process are explored: the creation of a culturally significant fund of texts, the formation of skills in linguocultural portraiture of words.The role of students' value attitudes for a harmonious existence in the speech space is revealed.

У кантэксце глабалізацыі як працэсу эканамічнай, палітычнай, культурнай уніфікацыі і інтэграцыі змяняецца адукацыя і адукацыйная прастора асобы. На думку вучоных, змяняецца і сам чалавек, яго сацыяльныя сувязі, якія непасрэдна праецыруюцца на патрабаванні да працэсу пазнання: "Чалавек атрымлівае новае вымярэнне .., якое валодае ўласцівасцямі, прынцыпова адрознымі ад традыцыйнага "аналагавага ўзаемадзеяння" [2, с. 93]. Сённяшнія трасфармацыі ўплываюць на сацыяльна-адукацыйную сітуацыю, што патрабуе распрацоўкі новых метадычных прыярытэтаў, адпаведных сучасным выклікам і рашэнням.

Сацыяльныя перамены апошніх гадоў узмацняюць *вектар каштоўнасных адносін да ведаў, да сферы пазнання*, што падразумявае як засваенне, прысваенне прадметнай інфармацыі, якой вучань павінен умець распараджацца, так і фарміраванне каштоўнаснай шкалы ў адносінах да грамадства, да свету, да сябе як да моўнай асобы. Сучасная школа як дзяржаўны інстытут сацыялізацыі асобы не можа быць свабоднай ад задачы станаўлення светапогляду маладых людзей. Менавіта праз школьную адукацыю набываюцца погляды, каштоўнасныя арыентацыі навучэнцаў, іх уяўленні і перакананні атрымліваюць сваё афармленне ў свядомасці дзяцей. Сучасная філасофія айчыннай адукацыі праз асноватворныя дакументы фармулюе асобаснае развіццё вучняў як найчарговую задачу. Так, "Канцэпцыя развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь да 2030 года" абвяшчае нацыянальную адукацыю "найвышэйшай каштоўнасцю беларускага народа". Мэта адукацыі вызначаецца як выхаванне асобы – "носьбіта каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры, грамадзяніна і патрыёта, яго сацыяльных кампетэнцый і духоўнай сталасці" [6].

Кожная вучэбная дысцыпліна мае свае магчымасці рэалізацыі задач развіцця асобы вучня, асаблівым патэнцыялам валодаюць моўныя

прадметы з прычыны духоўнай сутнасці моўнай адукацыі. Дасягненне мэты школьнай адукацыі ў кантэксце аксіялагізацыі як фарміравання каштоўнасных адносін да мовы, культуры свайго і іншых народаў, выхаванне пачуцця гонару за свой народ, за яго гісторыю, культурныя набыткі – пачэсны абавязак кожнага, хто працуе на ніве адукацыі.

Першы накірунак *аксіялагізацыі адукацыйнага працэсу – стварэнне культурна значымага фонду тэкстаў*, распрацоўка своеасаблівых канцэптуарыяў культуры, што ўтвараюць сучасную аксіялагічную прастору. Веданне прэцэдэнтных тэкстаў – праблема не толькі метадычная, педагагічная, але і агульнакультурная, міжпакаленчая, паколькі іх няведанне, незасваенне – паказчык адчужанасці, адарванасці ад культуры. Сучасная моўная адукацыя рэалізуе ідэю фарміравання лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі вучняў, абумоўленую кумулятыўнай функцыяй мовы і дыялектычнай узаемасувяззю мовы і культуры. Найбольш прадуктыўнай у гэтым плане з'яўляецца методыка, арыентаваная на засваенне канцэптаў культуры, на пабудову цэласнай карціны свету, а не толькі на пэўны аб'ём уласна лінгвістычных ведаў. Ключавым паняццем сучаснай методыкі выступае вучань як асоба і канцэпт як сістэмнаўтваральны кампанент моўнай карціны свету.

Як вядома, любая культура можа быць даследавана і апісана пры дапамозе ключавых слоў мовы, якія абслугоўваюць дадзеную культуру. *Лінгвакультуралагічны канцэпт, тэкст культуры* – тэрміны, без якіх цяжка ўявіць сучасную лінгвістыку і методыку. Актуалізацыя тэрмінаў адбылася за кошт ідэі фарміравання каштоўнасна-маўленчай сферы сучаснага школьніка. Прыцягальнасць ідэі вытлумачваецца назапашваннем "цытатнага фонду" (Б. М. Гаспараў) кожнай асобай як ускосным сведчаннем прыналежнасці і засвоенасці ядра нацыянальнай культуры. Тым больш, што кожны канцэпт можа быць разгорнуты ў тэкст як фрагмент цэласнай карціны свету.

У структуры зместу лінгвакультурнага канцэпту (С. Г. Варкачоў, В. І. Карасік, В. А. Маслава, Н. Л. Мішаціна, Г. Г. Слышкін і інш.) вучоныя вылучаюць паняційны, вобразны, значымы і каштоўнасны кампаненты. Так, праф. В.А. Маслава падкрэслівае, што культурная прастора беларусаў прадстаўлена моцнай сувяззю з роднай зямлёй, што раскрываецца праз канцэпты *"працавітасць, вынослівасць, памяркоўнасць, нетаропкасць, мяккасць характару"* [7, с. 40].

Другі напрамак *аксіялагізацыі адукацыйнага працэсу – увага дакаштоўнаснай вартасці* моўных адзінак. Ключавыя словы выступаюць прадметам увагі не толькі лінгвістычнага / філалагічнага аналізу, не толькі традыцыйным аб'ектам для вызначэння фанетыка-арфаэпічных, лексічных, словаўтваральных, граматычных уласцівасцей адзінкі. Сёння праца на ўроках мовы павінна быць скіравана на стварэнне *лінгвакультуралагічнага партрэта слова*, які падразумявае сэнсавы,

каштоўнасны ўзроўні ў вызначэнні канцэптуальна-культурнага статусу адзінкі. Паводле меркавання акадэміка Ю.Д. Апрасяна, адрозненне лінгвакультуралагічнага партрэта ад традыцыйнага лексікаграфічнага заключаецца ў насычэнні слоўнікавага артыкула інфармацыяй, спецыфіка якой – у інтэграваным характары прадстаўлення адзінкі [1, с. 126]. Задача лінгвакультуралагічнага партрэціравання – выяўленне семантычнага статусу слова як фрагмента моўнай карціны свету. Імкненне асэнсаваць слова праз яго культураносны пласт выклікала распрацоўку замалёвак у фармаце партрэта – лексікаграфічнага, культурна-моўнага, этналінгвістычнага (Ю. Д. Апрасян, А. Д. Дзейкіна, Л. М. Лёвушкіна, Н. Л. Мішаціна) або ў форме лінгвакультуралагічнага каментарыя (М. Л. Каўшова, С. В. Іванова, В. М. Тэлія). Лінгвакультуралагічны партрэт слова ствараецца на аснове інфармацыі, інтэрпрэтаванай з пазіцыі культуры, этыка-маўленчых нормаў і каштоўнасных установак лінгвістычнай супольнасці.

У такім разе слова выступае не толькі носьбітам уласна моўных характарыстык, але і праваднікам, прадстаўніком культурнай семантыкі. Гэта азначае, што адзінка з'яўляецца не толькі знакам мовы, але і выконвае функцыю знака культуры. Метадычнае асэнсаванне лексікаграфічнага партрэціравання заключаецца ў тым, што культура ўвасабляе свой аксіялагічны змест у мове як універсальным сродку азначвання свету, мова садзейнічае захаванню і трансляцыі агульнага запасу культурных каштоўнасцей.

Лінгвакультуралагічнае партрэціраванне слова ўключае прыёмы працы, што выбудоўваюць семантычную мадэль канцэпта [5, с. 165]:

– выяўленне лексічнага значэння слова (на аснове даведнікаў);

– устанаўленне ўнутранай формы слова на базе этымалагічнага і гісторыка-культурнага аналізу;

– выясненне паняційнага значэння слова (на аснове энцыклапедычных даведнікаў);

– вызначэнне словаўтваральных сувязей слова;

– аналіз спалучальных уласцівасцей адзінкі;

– "нанізванне" ключавых прымет слова-імені канцэпта;

– улік семантычных адносін з іншымі словамі культуры;

– паралелі з парэміялагічнага фонду мовы: фразеалагічныя звароты, параўнанні, метафарычныя выразы, крылатыя словы.

Для каштоўнаснай арыентацыі вучняў важна дапамагчы ім зразумець, што мова дае ўзоры эстэтычнага засваення рэчаіснасці, утрымлівае патэнцыял для духоўнага развіцця асобы. Засваенне моўнага багацця дазваляе спасцігаць свет паводле законаў логікі, прыгажосці, культуры. Дасканалае валоданне мовай падразумявае "здольнасць карыстацца культурнымі каштоўнасцямі ў жыццядзейнасці і актыўнай камунікацыі" [8, с. 1].

Чакаюць сур'ёзных даследаванняў *праблемы лічбавай дыдактыкі*, лічбавыя фарматы навучання для кожнага ўзроўню адукацыі – ад пачатковай школы да постдыпломнай адукацыі ў рэчышчы прыватных методык. Лічбавая дыдактыка трансфармуе характарыстыкі вучэбных тэкстаў на ўзроўні *прад'яўлення вучэбнай інфармацыі* (вербальная лінейная структура, сістэматызацыя матэрыялу / мультымадальнасць тэксту, змест якога забяспечваецца з дапамогай візуальнай, аўдыяльнай, мультымедыйнай сістэм); *на ўзроўні зместу і структуры тэксту* (паслядоўная, лагічная падача ведаў / полікодавасць тэксту, які ўтрымлівае вербальныя і невербальныя сродкі (іканічныя знакі, вобразныя знакавыя сістэмы – графіка, музыка, міміка); *на ўзроўні прызначэння ілюстрацыйных кампанентаў* (ілюстрацыйны матэрыял узмацняе пазнавальны, эстэтычны і эмацыянальны фон вучэбнага матэрыялу / інтэрактыўнасць як уласцівасць тэксту: выкарыстанне мадэлей, аб'ектаў дапоўненай рэальнасці, інтэрактыўных карт, схем, графікаў); *на ўзроўні экспрэсіўнасці і эмацыйнага характару тэксту* (займальнасць выкладу з дапамогай прыкладаў, метафар, параўнанняў, афарызмаў / эмацыянальнае ўздзеянне невербальных кампанентаў – відэафрагменты, фотаздымкі, эматыўныя знакі, элементы дызайнерскага афармлення).

У кантэксце сучасных лічбавых тэхналогій важна не растраціць набыткаў класічнай методыкі ў кантэксце развіцця маўлення дзяцей. Сучасныя псіхолагі актыўна даводзяць грамадскасці думку пра відавочныя тэндэнцыі змянення кагнітыўных здольнасцей, зніжэння параметраў маўленчага развіцця школьнікаў [3, с. 265]. Вынікі фіксуюцца ў несфарміраванасці ўменняў актыўнай аналітыка-ацэначнай перапрацоўкі інфармацыі, у звужанай інтэрпрэтацыі фонавых ведаў, невысокай інфармацыйнай значнасці паведамленняў. Вучоныя падкрэсліваюць: "Няма праблемы кліпавага мыслення, існуе праблема навучыць успрымаць інфармацыю" [4, с. 265]. Канфлікт пралягае паміж традыцыйнай скіраванасцю на адналінейны, структураваны тэкст і кліпава-арыентаваным чытачом як "прадуктам" экраннай культуры. Зразумела, што вырашэнне задачы гарманізацыі логіка-структурнага і іканічнага спосабаў мыслення знаходзіцца на мяжы вобразнай і лагічнай арганізацыі ведаў. Гэты канфлікт варта разглядаць "як пэўны эвалюцыйны этап у фарміраванні інтэлектуальных здольнасцей чалавека" [9, с. 51]. У спадчыну ад традыцыйнага фармату адукацыі, безумоўна, варта пакідаць набыткі, што суправаджаюць працэс навучання на працягу стагоддзяў, – фарміраванне матывацыі школьнікаў да ўдумлівага, непаспешлівага чытання тэкстаў як выпрацаваны класічны вопыт духоўнага жыцця чалавецтва, як механізм станаўлення асобы свядомага чытача.

Такім чынам,канец XX – пачатак XXI стагоддзя актуалізуе неабходнасць аксіялагічных ацэнак быцця, што высвечвае сутнасную метадычную задачу – абазначыць і сфарміраваць прыярытэты

ў каштоўнасных уяўленнях пра жыццё, веды, здароўе, чалавецтва. Для рашэння светапоглядных задач патрэбна адзінства метадалагічных і, безумоўна, грамадзянскіх установак педагогаў. Роля настаўніка, выхавальніка мае першаснае, зыходнае значэнне і сёння. Так, нямецкі філосаф Карл Ясперс яшчэ на пачатку XIX стагоддзя падкрэсліваў: "Выхаванне прыходзіць у заняпад, калі гістарычна ўспрынятая субстанцыя распадаецца ў людзях, якія нясуць за яе адказнасць" [10, с. 14]. Сучасная моўная адукацыя павінна вырашаць першачарговыя задачы – вучыць разумець, адчуваць, цаніць родную мову, мовы суседзяў, іншых народаў, выхоўваць каштоўнасныя адносіны да літаратуры, гісторыі, да нацыянальных і агульначалавечых традыцый. Каштоўнасныя ўстаноўкі забяспечваюць умовы гарманічнага суіснавання людзей у маўленчым асяроддзі, у якім шануецца слова, культывуецца эстэтыка маўлення, захоўваюцца этыкетныя і іншыя нормы камунікатыўна мэтазгодных паводзін, адобраных грамадствам.

Літаратура

1. Апресян, Ю. Д. Формальная модель языка и представление лексикографических знаний / Ю. Д. Апресян // Вопросы языкознания. – 2009. – № 6. – С. 123–138.
2. Асочаков, Ю. В. "Цифровая либерализация", "цифровое неравенство", киберскептицизм / Ю. В. Асочаков // Вестник Санкт-Петербургского университета. – Серия 12. Психология. Социология. Педагогика. – 2015. – Вып. 2. – С. 93 – 99.
3. Бутакова, Л. О. Ментальные основания языковой способности: когнитивный подход к речевым нарушениям / Л. О. Бутакова // Лингвистика и школа: доклады междунар. науч. конф. / под ред. Т. М. Григорьевой. – Красноярск: КГУ, 2012. – С. 263 – 271.
4. Грановская, Р. М. Элементы практической психологии / Р. М. Грановская. – СПб.: Речь, 2003. – 655 с.
5. Дейкина, А. Д. Аксиологическая методика преподавания русского языка: монография / А. Д. Дейкина. – М.: МПГУ, 2019. – 210 с.
6. "Концепция развития системы образования Республики Беларусь до 2030 года". – Рэжым доступу: https://edu.gov.by/. – Дата доступу: 24.09.2024.
7. Маслова, В. А. Национальный характер сквозь призму языка: монография / В. А. Маслова. – Витебск: ВГУ имени П. М. Машерова, 2011. – 176 с.
8. Николаенко, С. В. Лингвометодическая система социокультурного развития учащихся на основе владения ценностями белорусской культуры в контексте изучения русского языка (V – XI классы): автореф. … дисс. д-ра пед.наук: 13.00.02 / С. В. Николаенко. – Минск: НИО, 2016. – 64 с.
9. Нургалеева, Л. В. Конфликт иконических и логических форм интеллекта в современной образовательной среде / Л. В. Нургалеева // Открытое и дистанционное образование. – 2005. – № 2. – С. 46-51.
10. Ясперс, К. Духовная ситуация времени / К. Ясперс. – М.: АСТ, 2013. – 285 с.